# АСАБЛІВАСЦІ МАРФАЛАГІЧНАГА СПОСАБУ СЛОВАЎТВАРЭННЯ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

С. В. Агароднікава, Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт

Найбольш пашыраным спосабам утварэння слоў у беларускай мове з’яўляецца так званы марфалагічны спосаб, які ахоплівае ўтварэнне слоў з дапамогай службовых марфем (суфіксаў, прыставак, постфіксаў). Трэба адзначыць, што некаторыя часціны мовы аддаюць перавагу якім-небудзь адным словаўтваральным сродкам. Напрыклад, назоўнікі ўтвараюцца галоўным чынам з дапамогай суфіксаў, а таксама слова- і асноваскладання. Дзеясловы вельмі актыўна ўтвараюцца з дапамогай розных прыставак.

Разгледзім коратка асаблівасці суфіксальнага і прыставачнага словаўтварэння ў беларускай мове.

Неабходна заўважыць, што не ўсе суфіксы з’яўляюцца словаўтваральнымі. Некаторыя могуць выконваць функцыі формаўтварэння, напрыклад, суфікс ***-ў-/-л-***, задапамогай якога ўтвараюцца формы прошлага часу дзеясловаў: чытаць – чыта-*ў*, чыта-*л*-а, чыта-*л*-і і інш. У прыведзеным прыкладзе элемент ***-ў-/-л-*** з’яўляецца суфіксам і выступае акульным паказчыкам прошлага часу. Да яго далучаюцца канчаткі, якія ўказваюць на канкрэтныя формы роду і ліку. Словаўтваральныя суфіксы далучаюцца да ўтваралючай асновы і ўтвараюць новае слова. Вытворнае слова можа адносіцца да той жа часціны мовы, што і ўтвараючае: школ-а – школь-*нік*, сонц-а – сон-*ейк*-а, сін-і – сін-*еньк*-і, бел-ы – бел-*ават*-ы. Часта з дапамогай суфіксаў утвараюцца словы, якія адносяцца да іншай часціны мовы. Напрыклад, ад асноў дзеясловаў могуць утварацца назоўнікі і прыметнікі: піса-ць – піс-*ар*, чыта-ць – чыт-*ач*, чыта-*нн*-е, ляце-ць – лёт-*чык*, габлява-ць – габлява-*льн*-ы і інш. Ад асноў назоўнікаў утвараюцца прыметнікі і дзеясловы: лес – ляс-*н*-ы, горад – гарад-*ск*-і, піл-а – піл-*ава*-ць, мароз – мароз-*і*-ць і г. д.

Характэрнай асаблівасцю суфіксальнага словаўтварэння з’яўляецца тое, што суфіксы маюць пры сабе і пэўныя граматычныя паказчыкі (канчаткі), якія ўказваюць, напрыклад, на род, лік і склон назоўнікаў. Па сутнасці, канчаткі як паказчыкі граматычных характарыстык вытворнага слова складаюць разам з суфіксам адзіны словаўтваральны элемент.

Гэта асаблівасць уласціва ўсім словаўтваральным суфіксам назоўнікаў і прыметнікаў. Выключэнне складаюць суфіксы дзеясловаў *-ва-, -а-, -ну-* і інш., якія пры аддзеяслоўным словаўтварэнні могуць ужывацца без канчаткаў: перапісаць – перапіс-*ва*-ць, уздыхаць – уздых-*ну*-ць, прыкмеціць – прыкмяч-*а*-ць і г. д.

Параўнальнае ўтварэнне дзеясловаў ад нішых часцін мовы, калі да ўтваралючай асновы словаўтваральныя суфіксы далучаюцца разам з

канчаткам неазначальнай формы дзеяслова: сін-і – сін-*е*-ць, стары – стар-э-ць, вечар – вечар-э-ць.

Прыставачнае словаўтварэнне ў беларускай мове назбольш характэрна для дзеясловаў і ў меншай ступені для прыметнікаў. Пры ўтварэнні новых слоў прыстаўкі далучаюцца да ўтвараючага слова цалкам, не змяняючы яго словазмянияльнай парадыгмы і прыналежнасці да пэўнай часціны мовы. Але трэба адзначыць, што словаўтваральныя прыстаўкі таксама ўплываюць на граматычную характарыстыку слова. Так, ад невытворных дзеясловаў незакончанага трывання з дапамогай прыставак утвараюцца дзеясловы законченага трывання: мыць – *вы*-мыць, гаварыць – *за*-гаварыць, будаваць – *па*-будаваць і г. д.

Беларускае дзеяслоўнае словаўтварэнне характарызуецца шырокай распаўсюджанасцю двайной прэфіксацыі. Гэта значыць, што ад прыставачных дзеясловаў шляхам далучэння яшчэ адной прыстаўкі ўтвараецца новае слова: *на*-абтрасаць, *па*-зачэсваць, *па*-пераконваць і г. д.

Ва ўтварэнні дзеясловаў з двайнымі прыстаўкамі назіраюцца дзве характэрныя тэндэнцыі. Сутнасць першай заключаецца ў тым, што другая прыстаўка далучаецца непасрэдна да першай у наступным акце словаўтвараэння. Параўн.: вазіць – *па*-вазіць – *па*-*па*-вазіць. Адметнай рысай гэтай тэндэнцыі з'яўляецца тое, што другая прыстаўка не змяняе трывання дзеяслова, тады як першая прыстаўка надае дзеяслову значэнне закончанага трывання. Звычайна такія дзеясловы ўтвараюцца з дапамогай прыстаўкі *па*-, словаўтваральнае значэнне якой 'выконваць дзеянне доўга, неаднаразова'.

Другая тэндэнцыя характарызуецца тым, што паміж далучэннем першай і другой прыставак існуе этап суфіксальнага словаўтварэння.

Такім чынам, захоўваецца заканамернасць змянення трывання дзеяслова пры прыставачным словаўтварэнні. На першым этапе прыстаўка пераўтварае дзеяслоў незаконченага трывання ў новае слова законченага трывання: пісаць – *пры*-пісаць. Ад *прыпісаць* з дапамогай суфікса *–ва-* утвараецца дзеяслоў незаконченага трывання прыпіс-*ва*-ць. Ад яго ў сваю чаргу зноў ужо ўтвараецца дзеяслоў законченага трывання *на*-прыпісваць. Гэты тып двайной прэфіксацыі ў сучасный беларускай мове сустракаецца часцей у параўнанні з першым.